# Прыметнік: тэматычная праверка ведаў (6 клас)

***Н. У. Салаўян,***
***настаўнік беларускай мовы і літаратуры***
***СШ №16 г. Ліды***

Мэты ўрока:
адукацыйныя:
- садзейнічаць сістэматызацыі і абагульненню ведаў па тэме; удасканаленню уменняў даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку прыметніку;
- уключыць вучняў у дзейнасць па паўтарэнні і сістэматызацыі ведаў па тэме “Прыметнік” з апорай на раней вывучанае;
- працягваць фарміраваць навыкі функцыянальнай пісьменнасці.

развіваючыя:
- развіваць агульнаадукацыйныя ўменні і навыкі;
- садзейнічаць выпрацоўцы ўменняў работы ў парах;
- развіваць культуру вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;
- садзейнічаць развіццю інтарэсу да вывучаемай тэмы.

выхаваўчыя:
- садзейнічаць выхаванню любові да прыроды;
- стымуляваць станоўчыя адносіны школьнікаў да ўрокаў беларускай мовы.

Прагназуемы вынік. У канцы ўрока вучні, у выніку абагульнення ведаў па тэме “Прыметнік”, навучацца рабіць яго марфалагічны разбор і падрыхтуюцца да паспяховага выканання тэста.

Тып урока**:** урок-практыкум

Абсталяванне і дыдактычнае забеспячэнне ўрока**:** сшытак, падручнік, дошка, карткі, мультымедыйная ўстаноўка, мультымедыйная прэзентацыя па тэме “Прыметнік”.

## Ход урока

***І. Арганізацыйны этап***

Настаўнік. Добры дзень, мае маленькія сябры! Вітаю вас у гэты марозны зімовы дзень! Спадзяюся, што такое цудоўнае надвор’е паспрыяе вашай плённай працы на ўроку. На працягу многіх урокаў мы вывучалі тэму “Прыметнік”. Паўтаралі тое, што ведалі аб гэтай часціне мовы, набывалі новыя веды, прымянялі іх на практыцы. Крок за крокам і мы наблізіліся да тэмы ўрока. Заклікаю вас выкарыстоўваць усе веды, якія вы атрымалі на папярэдніх уроках.

***ІІ. Праверка дамашняга задання (выбарачна па варыянтах)***

Настаўнік. Дома вы працавалі над тэмай “Правапіс не(ня) з прыметнікамі”. Прапаную І варыянту зачытаць прыклады, дзе *не(ня)* ўжываецца разам з прыметнікамі. ІІ варыянт прывядзе прыклады асобнага напісання *не(ня)* з прыметнікамі.

***III. Арфаграфічная хвілінка***

Настаўнік прапануе ўставіць літары ў словах і падкрэсліць тыя, якія змянілі свой правапіс у сувязі з новымі правіламі арфаграфіі, арганізоўвае праверку слоў пры дапамозе слайдаў.

*С... кратар, ш…рсцяны, сальфеджы…, с…крэт, р…дактар, р…монт, прынт…р, вет…ран, пч…ляр, світ…р, тры…, бухгалт…р, орд…р, др…вотня, шніц…ль, чар…ўнік.*

***IV. Мэтавызначэнне***

Настаўнік. Давайце паспрабуем вылучыць сэнсавыя адзінкі, з якіх складаецца тэма і аформіць у выглядзе логіка-сэнсавай мадэлі на асобных лістах. (Дадатак 3).

Але перш-наперш здагадайцеся, на якую тэму гэта мадэль:

Я аздабляю нашу мову:
Даю прыметы розным словам.
Наўрад ці зможаш без мяне ты
Прадмет адрозніць ад прадмета. (Прыметнік) (слайд 3)

Вучні запаўняюць пяць асноўных характарыстык прыметніка, акрамя яго марфалагічнага разбору .




Настаўнік. У канцы ўрока, пасля сістэматызацыі ведаў па тэме “Прыметнік”, мы звернемся да марфалагічнага разбору прыметніка, і тады вы зможаце завяршыць запаўненне ЛСМ.

***V. Актуалізацыя ведаў***

Настаўнік. 9 снежня 2011 года мы святкавалі юбілей з нагоды нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча. Давайце яшчэ раз звернемся да яго творчасці. З верша "Зімой" выпішыце ўсе прыметнікі.

| | |
|---|---|
| Здароў, марозны, звонкі вечар! | Як мары, белыя бярозы |
| Здароў, скрыпучы, мяккі снег! | Пад сінявой начной стаяць, |
| Мяцель не вее, сціхнуў вецер, | У небе зоркі, ад марозу |
| І волен лёгкіх санак бег. | Пахаладзеўшыя, дрыжаць. |

Зачытайце, што ў вас атрымалася, і праверце сябе (слайд 6). Працу над гэтымі прыметнікамі мы працягнем крыху пазней.

***Развіццё зрокавай і слыхавой памяці.*** (Франтальная работа)

Настаўнік. Зараз я пакажу вам слайд, вы прачытаеце яго двойчы, а пасля паспрабуеце адказаць на пытанні. Будзьце ўважлівымі! (слайды 7-8)

| |
|---|
| *самы цёплы, бабулін, гусцейшы, марозны, калмыцкі,<br>вераб'іны, высока, наваполацкі* |

а) назавіце прыналежны прыметнік (*бабулін*);
б) складаны прыметнік (*наваполацкі*);
в) назавіце прыметнік у простай форме вышэйшай ступені (*гусцейшы*);
г) назавіце найвышэйшую ступень параўнання прыметніка (*самы цёплы*);
д) слова на правапіс -н- у прыметніках (*вераб'іны*);
е) выключэнне з правіла аб прыметніку з суфіксам -ск (*калмыцкі*);
ж) які з прыметнікаў характарызуе сённяшні дзень? (*марозны*);
з) якое прыслоўе ўжыта сярод прыметнікаў? (*высока*);

***Творчае заданне "Упрыгожваем слова"*** (вусныя адказы)

Настаўнік. Мы будзем упрыгожваць слова "*зіма*". Кожнаму трэба назваць па прыметніку, якія асацыіруюцца з зімой, а хто не ведае – выбывае. Малюнкі на слайдзе могуць вам дапамагчы. (слайд 9)

Давайце паспрабуем ужыць гэтыя прыметнікі у сказах (4-5) для апісання зімовага пейзажу. (слайд 10)

***VI. Фізкультхвілінка***

Настаўнік прапануе з дапамогай мімікі і жэстаў паказаць усе рухі персанажу з верша. (слайд 11)

Хомка, хомка, хамячок,
Паласаценькі бачок.
Хомка раненька ўстае,
Шчочкі мые, шыйку трэ.
Падмятае хомка хатку
І выходзіць на зарадку.
Раз, два, тры, чатыры, пяць!
Хомка моцным хоча стаць.
(Дзеці паказваюць усе рухі хамячка)

Настаўнік. Вы таксама, як і наш хомка, павінны стаць фізічна моцнымі, каб дапамагаць слабым. Але ў сучасным жыцці вам спатрэбяцца яшчэ і моцныя веды. Таму працягваем працаваць далей.

***Практыванне "Знайдзі лішні"*** (на картках, работа ў парах)

У радках падкрэсліце чацвёрты лішні прыметнік. Свой адказ абгрунтуйце:

а) дубовы, зімні, высокі, вясковы (*высокі – якасны*);

б) весялейшы, найдужэйшы, карацейшы, святлейшы (*найдужэйшы – найвышэйшая ступень параўнання*);

в) лімонны, будзённы, аконны, страшэнны (*страшэнны – -энн*);

г) Міцеў, Васеў, бабулін, бацькаў (*бабулін – прыналежны прыметнік жаночага роду*).

***Вусная праца "Ланцужок"*** (франтальна)

Узгадайце: ад якой часціны мовы ўтвараюцца прыметнікі? (Ад назоўнікаў)

Давайце ўтворым ад наступных назоўнікаў прыметнікі пры дапамозе неабходных суфіксаў. (слайд 13)

*Туман, восень, племя, горад, брат, Парыж, лімон, Цянь-Шань, конь, цемя, грамада, ткач, таварыш, француз, камень, снежань, полымя, швед, красавік, казах, качка, семя, лёд, салома.*

***VII. Замацаванне новага матэрыялу***

Пасля актуалізацыі ведаў па ўсіх пытаннях тэмы "Прыметнік" вучні знаёмяцца з парадкам марфалагічнага разбору прыметніка, выконваюць заданні, прапанаваныя настаўнікам.

Настаўнік. Вы справіліся з усімі прапанаванымі заданнямі, і прыйшоў час папрацаваць у групах (па 4 чалавекі). Размяркуйце карткі ў такой паслядоўнасці, каб атрымаўся ланцужок марфалагічнага разбору прыметніка. (Часціна мовы, пачатковая форма, сэнсавы разрад, ступень параўнання, форма, лік, род, склон, сінтаксічная роля.) Праверце свае варыянты разбору з інфармацыяй слайда (слайд 14). Для замацавання парадку марфалагічнага разбору прыметніка дапоўніце ЛСМ.

Настаўнік. Па варыянтах зрабіце марфалагічны разбор прыметнікаў са сказаў. А 3 вучні на адвароце дошкі выканаюць гэты ж разбор.

*1 – Мароз малюе ўзоры рукою шчодрай.*

*2 – Ад адной вавёрчынай сталовай да другой па снезе цягнуцца сляды.*

*3 – Многа радасці можна зазнаць у зімовым лесе.*

Давайце праверым, што атрымалася ў вас і ў вучняў каля дошкі. (слайд 15)

***VIII. Выкананне тэста на картках***

Настаўнік. Зараз мы выканаем тэст па варыянтах. Паглядзіце заданні, магчыма, у вас ўзнікнуць пытанні. На выкананне 5 хвілін.

***1 варыянт***

1. Утварыць і запісаць усе магчымыя формы ступеней параўнання прыметнікаў: *вясёлы, дрэнны, жывы.*

2. Дапісаць канчаткі: *бацькав.. надзе.., з вясёлы.. смех.., з-пад жоўт.. лісц.., са стар.. дрэв.., каля садов.. лаўк.., на шырок.. дароз…*

3. Пазначыць спосаб утварэння прыметнікаў: *асенні, вечназялёны, дзедаў, замежны.*

4. Раскрыць дужкі, напісаць не (ня) разам ці асобна:

*(не, ня) далёка,*
*(не, ня) высокі ўраджай,*
*(не, ня) пахісны змагар,*
*сонечны, але (не, ня) яркі дзень,*
*(не, ня) цяжкая сумка.*

***2 варыянт***

1. Утварыць і запісаць усе магчымыя формы ступеней параўнання прыметнікаў: *гняды, вялікі,салодкі.*

2. Дапісаць канчаткі: *ад леваг.. бераг.., Аленчын.. каньк.., для дзіцяч.. садк.., з-за кніжн.. шаф.., з лепш.. клас.., пад высок.. вярб…*

3. Пазначыць спосаб утварэння прыметнікаў: *безбілетны, птушыны, беларуска-ўкраінскі, развясёлы.*

4. Раскрыць дужкі, напісаць не (ня) разам ці асобна:

*зусім (не, ня) яркі колер,*
*(не, ня) абсяжны прастор,*
*(не, ня) лёгкая, а складаная задача,*
*(не, ня) чуваны поспех,*
*(не, ня) сцерпны боль.*

***IX. Рэфлексія***

Настаўнік прапануе адказаць на пытанні:

- Якія заданні былі для вас найбольш цікавыя?
- Пры выкананні якіх заданняў у вас узніклі цяжкасці?
- Якія пытанні тэмы трэба паўтарыць дома?

***X. Выстаўленне адзнак***

***XI. Дамашняе заданне***

Скласці тэкст мастацкага стылю на адну з тэм з выкарыстаннем прыметнікаў, якія мы выпісалі з верша М. Багдановіча “Зімой”: “Мае зімовыя забавы” або “Зімой у лесе”.

**Падагульненне па раздзеле**

# “ПРЫМЕТНІК”

***Вітаем усіх на нашым уроку!***



# Арфаграфічная хвілінка

| | |
|---|---|
| *С... кратар* | сакратар |
| *ш...рсцяны* | шарсцяны |
| *сальфеджы...* | сальфеджыа |
| *с...крэт* | сакрэт |
| *р...дактар* | рэдактар |
| *р...монт* | рамонт |
| *прынт...р* | прынтар |
| *вет...ран* | ветэран |
| *пч...ляр* | пчаляр |
| *світ...р* | світар |
| *тры...* | трыа |
| *бухгалт...р* | бухгалтар |
| *орд...р* | ордар |
| *др...вотня* | дрывотня |
| *шніц...ль* | шніцаль |
| *чар...ўнік* | чараўнік |



# ПРАБЛЕМНАЕ ПОЛЕ ЎРОКА



Я аздабляю нашу мову:
Даю прыметы розным словам.
Наўрад ці зможаш без мяне ты
Прадмет адрозніць ад прадмета.

**Прыметнік**




Сэнсавыя разрады
Форма
Ступень параўнання
Зменныя марфалагічныя прыметы
Агульнае значэнне
Прыметнік
Сінтаксічная роля
Марфалагічны разбор
Правапіс


Прыметнік
Сэнсавыя разрады
Прыналежныя
Адносныя
Якасныя
Форма
Кароткая
Поўная
Ступень параўнання
Найвышэйшая
Вышэйшая
Зменныя марфалагічныя прыметы
Склон
Лік
Род
Сінтаксічная роля
Азначэнне
Выказнік
Агульнае значэнне
пытанні
прымета прадмета
самастойная часціна мовы
Марфалагічны разбор
Часціна мовы
Пач. форма
Сэнсавы разрад
Ступень параўнання
Форма
Род
Лік
Склон
Сінтаксічная роля
Правапіс
н – нн
не, ня
ск
Складаныя прыметнікі
праз злучок
разам

# Максім Багдановіч “Зімой”

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы , мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.
Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі, ад марозу
Пахаладзеўшыя, дрыжаць.



# Развіваем памяць і запамінаем

*самы цёплы*

*высока*

*калмыцкі*

*бабулін*

*гусцейшы*

*марозны*

*вераб’іны*

*навапалацкі*



# Правяраем:

***самы цёплы***

***высока***

***калмыцкі***

***бабулін***

***гусцейшы***

***марозны***

***вераб'іны***

***навапалацкі***



# Якая яна, зіма?












Упрыгожваем словам...

# Хвілінка адпачынку



Хомка, хомка, хамячок,
Паласаценькі бачок.
Хомка раненька ўстае,
Шчочкі мые, шыйку трэ.
Падмятае хомка хатку
І выходзіць на зарадку.
Раз, два, тры, чатыры, пяць!
Хомка моцным хоча стаць.



# Знайдзі лішні прыметнік

а) Дубовы, зімні, высокі , вясковы (якасны)

б) Весялейшы, найдужэйшы , карацейшы, святлейшы (найвышэйшая ступень параўнання)

в) Лімонны, будзённы, аконны, страшэнны (суфікс - энн)

г) Міцеў, Васеў, бабулін , бацькаў (прыналежны, ж. род)



# Вусная праца “Ланцужок”

-ск

-н

-нн



# Марфалагічны разбор прыметніка

- Часціна мовы
- пачатковая форма
- сэнсавы разрад
- ступень параўнання
- Форма (поўная/кароткая)
- лік
- род
- склон
- сінтаксічная роля



# Марфалагічны разбор прыметніка

***<u>Шчодрай</u>*** (рукою) – прыметнік, п.ф. – шчодры, якасны, поўная форма, адз. лік, ж.р., Т. скл., азначэнне.

***<u>Вавёрчынай</u>*** (сталовай) – прыметнік, п.ф. – вавёрчын, прыналежны, адз. лік, ж.р., Т.скл., азначэнне.

***<u>Зімовым</u>*** (лесе) – прыметнік, п.ф. – зімовы, адносны,поўная форма, адз. лік, м.р., М.скл., азначэнне.



# Выкананне тэста

## Усім поспехаў!!!



# Падводзім вынікі:

•Якой тэме быў прысвечаны ўрок?

•Якія заданні былі для вас найбольш цікавыя?

•Пры выкананні якіх заданняў у вас узніклі цяжкасці?

•Якія пытанні тэмы трэба паўтарыць дома?



# Дамашняе заданне:



“Мае зімовыя забавы”



“Зімой у лесе”